**25.** Прачытайце ўважліва радкі з твора Якуба Коласа “Савось-распуснік”. Хто быў выхаванцам Паўла-дзеда? Якое слова прапушчана?

*У Савосева суседа*
*Быў пярэсценькі … .*
*Выхаванец Паўла-дзеда,*
*Такі слаўны пестунок!*

**А)** папугай. **Б)** сабачка. **В)** каток.
**Г)** шпачок. **Д)** гусачок.

---

**26.** Васіль прапанаваў сябрам пагуляць у гульню: са слоў скласці народныя выразы. У сяброў атрымалася:

*1) На зімні стол жнівень рыхтуе …;*
*2) Жнівень варыць, а … да стала падае;*
*3) Каса любіць брусок і … кусок;*
*4) У чэрвені першую ягаду ў … кладуць, а другую – дамоў нясуць.*

Якіх слоў сябры не змаглі падабраць?

*а) верасень; б) рот; в) кош; г) чэрвень; д) сала;*
*е) абрус; ё) разнасол; ж) жалеза; з) сноп.*

**А)** 1-а, 2-б, 3-в, 4-г. **Б)** 1-д, 2-е, 3-ё, 4-ж. **В)** 1-з, 2-е, 3-ж, 4-в.
**Г)** 1-ё, 2-а, 3-д, 4-б. **Д)** 1-з, 2-в, 3-ё, 4-е.

---

**27.** Высушаная і змельчаная скурка пладоў цытрусавых называецца … .

**А)** цукар. **Б)** цэдра. **В)** карыца. **Г)** ванілін. **Д)** перац.

---

**28.** Перыфраза – выраз, які з’яўляецца апісальнай перадачай сэнсу другога выразу ці слова. Напрыклад, перыфразы:

*1) балотны цясляр; 2) баравая варажбітка;*
*3) залацістая струна сонца; 4) агнявая вужака.*

Сэнсам якіх слоў яны з’яўляюцца? Выберыце варыянты.

*а) зязюля; б) маланка; в) бабёр; г) прамень.*

**А)** 1-а, 2-б, 3-в, 4-г. **Б)** 1-б, 2-а, 3-г, 4-в. **В)** 1-в, 2-а, 3-г, 4-б.
**Г)** 1-в, 2-г, 3-б, 4-а. **Д)** 1-г, 2-в, 3-а, 4-б.

---

**29.** Мы выкарыстоўваем літары ***й***, ***ў***. Значок над літарамі пазначае кароткае вымаўленне адпаведных гукаў [й] і [ў] і мае навуковую назву … .

**А)** дэфіс. **Б)** рысачка. **В)** працяжнік. **Г)** злучок. **Д)** брэвіс.

---

**30.** У гэтым горадзе ў 1980 годзе знойдзена берасцяная грамата. У самім горадзе і яго ваколіцах налічваецца больш за 20 помнікаў архітэктуры. А яшчэ гэты горад называюць “беларускім Суздалем”. Пра які горад ідзе размова?

**А)** пра Смаргонь. **Б)** пра Брэст. **В)** пра Мсціслаў.
**Г)** пра Быхаў. **Д)** пра Слуцк.

---

Арганізатар гульні-конкурсу «Буслік» –
Грамадскае аб’яднанне «Беларуская асацыяцыя «Конкурс»
220045, г. Мінск, вул. Яна Чачота, 16 тэл. (017) 375 66 17, 375 36 23
e-mail: info@bakonkurs.by https://bakonkurs.by/ https://конкурс.бел/
Унітарнае прадпрыемства «Выдавецкі цэнтр БА «Конкурс». Заказ 2. Тыраж 28000 экз. 2022 г.

# Гульня-конкурс па беларускай мове і літаратуры «БУСЛІК-2022»

*Чацвер, 17 лютага 2022 года*

- працягласць работы над заданнем 1 гадзіна 15 хвілін;
- на кожнае пытанне маецца толькі адзін правільны адказ;
- на старце ўдзельнік атрымлівае авансам 30 балаў;
- кожны правільны адказ адзначаецца трыма, чатырма ці пяццю баламі; колькасць балаў, якія атрымлівае ўдзельнік, адказваючы на пытанне правільна, вызначаецца складанасцю пытання (10 лягчэйшых пытанняў – па 3 балы, 10 найбольш складаных – па 5 балаў, астатнія 10 – па 4 балы); складанасць пытання вызначаецца па колькасці ўдзельнікаў, якія правільна на яго адказалі;
- за няправільны адказ аднімаецца чвэрць балаў, прадугледжаных за дадзенае пытанне, у той час, як не даўшы адказу, удзельнік захоўвае раней набраныя балы;
- максімальная колькасць балаў, якой ацэньваецца заданне конкурсу, – 150, аднак аўтары задання не прадугледжваюць яго поўнага выканання ўдзельнікамі; у заданне гульні-конкурсу ўключаны пытанні, веды пра якія не прадугледжаны школьнай праграмай;
- карыстацца даведнікамі, падручнікамі, слоўнікамі, іншымі пісьмовымі або друкаванымі матэрыяламі, электроннымі сродкамі інфармацыі і сувязі забараняецца; не дазваляецца таксама абменьвацца інфармацыяй з іншымі ўдзельнікамі і задаваць пытанні настаўніку; ручка, чарнавік, картка і заданне – гэта ўсё, што патрэбна мець удзельніку;
- самастойная і сумленная работа над заданнем – галоўнае патрабаванне арганізатараў да ўдзельнікаў конкурсу;
- пасля заканчэння конкурсу лісток з заданнем і чарнавік удзельнік забірае з сабой і захоўвае іх да падвядзення канчатковых вынікаў;
- вынікі ўдзельнікаў размяшчаюцца на сайце https://bakonkurs.by/ праз 1–1,5 месяцы пасля правядзення конкурсу.

---

## Заданне для вучняў 5-6 класаў



**1.** Які вядомы мастак слова на фотаздымку?

**А)** Янка Купала. **Б)** Якуб Колас.
**В)** Максім Багдановіч. **Г)** Уладзімір Дубоўка.
**Д)** Міхась Лынькоў.

---

**2.** Выраз “Прывітанне!” выкарыстоўваюць у сітуацыі … .

**А)** сустрэчы. **Б)** развітання. **В)** завяршэння справы.
**Г)** вырашэння складанага пытання. **Д)** пажадання поспехаў у справе.

---

**3.** Закончыце народнае выслоўе: *Ручай поіць раку, рака поіць … .*

**А)** усіх. **Б)** луг. **В)** лес. **Г)** птушак. **Д)** мора.

---

**4.** Дадзены назоўнікі:

*1) баршчэўнік; 2) дрыгва; 3) паганка; 4) амялушка.*

Падбярыце адпаведнікі ў рускай мове:

*а) чомга; б) свиристель; в) трясина; г) борщевик.*

**А)** 1-а, 2-б, 3-в, 4-г. **Б)** 1-б, 2-а, 3-г, 4-в. **В)** 1-в, 2-г, 3-б, 4-а.
**Г)** 1-г, 2-в, 3-а, 4-б. **Д)** 1-г, 2-б, 3-в, 4-а.

**5.** Якое слова мае значэнне ‘тлушч з насення раслін’?

**А)** клей. **Б)** алей. **В)** сіроп. **Г)** маянэз. **Д)** воцат.

**6.** У якіх словах з прапанаваных на месцы пропуску напішаце раздзяляльны мяккі знак (**ь**)?

*1) раз..езд; 2) здол..ны; 3) мадэл..ер; 4) лос..; 5) брыл..янт.*

**А)** ва ўсіх словах. **Б)** няма патрэбных слоў. **В)** у 1, 3. **Г)** у 2, 4. **Д)** у 3, 5.

**7.** Прачытайце ўважліва назвы беларускіх рэк: *1) Нёман; 2) Свіслач; 3) Дзвіна; 4) Волма.* У якім слове “схавалася” яшчэ адна назва беларускай ракі, выток якой знаходзіцца каля вёскі Глушынцы ў Дзяржынскім раёне Мінскай вобласці (склады і літары не перастаўляць)?

**А)** няма патрэбнай назвы. **Б)** у 1. **В)** у 2. **Г)** у 3. **Д)** у 4.

**8.** Спрадвеку гэта дрэва лічыцца ў народзе сімвалам жыватворнай сілы. Яго галінкі асвячалі падчас Вербнай нядзелі ў царкве, сімвалічна “білі” ўсіх членаў сям’і, захоўвалі ў доме на працягу ўсяго года. Лічылася, што так можна абараніцца ад усяго дрэннага і быць здаровым. Як называецца гэта дрэва?

**А)** асіна. **Б)** бяроза. **В)** ліпа. **Г)** вярба. **Д)** дуб.

**9.** Якія назоўнікі з дадзеных адносяцца да І скланення?

*1) поле; 2) сцяна; 3) подпіс; 4) вышыня; 5) радасць.*

**А)** усе назоўнікі. **Б)** няма патрэбных назоўнікаў. **В)** 1, 3. **Г)** 2, 4. **Д)** 3, 5.

**10.** Прачытайце вершаваныя радкі П. Панчанкі. Якім членам сказа з’яўляецца выдзеленае слова?

*А летнім днём блакіт нябёс бясконцы*
*І воблакі – **мелодыя** без слоў.*

**А)** дзейнікам. **Б)** выказнікам. **В)** дапаўненнем. **Г)** азначэннем. **Д)** акалічнасцю.

**11.** Дадзены сказ:

*Дзед сказаў, што сухое сена добра было б закінуць адразу на вышкі.*

Які адпаведнік у рускай мове мае падкрэсленае ў сказе слова?

**А)** погреб. **Б)** чердак. **В)** укрытие. **Г)** шалаш. **Д)** веранда.

**12.** Якое значэнне адпавядае народнаму выслоўю *біць у хамут*?

**А)** ‘драмаць’. **Б)** ‘гучна спяваць’. **В)** ‘прыезд дадому’.
**Г)** ‘празмерна хваліцца чым-небудзь. **Д)** ‘упарціцца, рашуча не пагаджацца’.

**13.** Колькі [ц’] у словах вершаваных радкоў М. Стральцова?

*Такая ціш! Чуваць здаля*
*Звон ад вядра і рып марозны*
*Бацькоўскай студні жураўля.*

**А)** 0. **Б)** 1. **В)** 2. **Г)** 3. **Д)** 4.

**14.** У якіх словах з прапанаваных на месцы пропуску напішаце літару ***а***?

*1) д..мафон; 2) дальн..мерны; 3) д..літкатны; 4) д..лмацінец.*

**А)** ва ўсіх словах. **Б)** няма патрэбных слоў. **В)** у 1, 2. **Г)** у 2, 3. **Д)** у 3, 4.

**15.** Старажытнае народнае паданне аб легендарных героях, багах, аб паходжанні свету і розных з’яў прыроды называецца … .

**А)** міф. **Б)** аповесць. **В)** п’еса. **Г)** апавяданне. **Д)** эсэ.

**16.** Колькі назоўнікаў з ***[ш]*** у вершаваных радках В. Гардзея?

*Званочкі не тапчы над роснай сцежкай!*
*Не рві маю шыпшыну, не ламай!*
*І санцацвет аранжавай усмешкай*
*Азорыць наш бясконца мілы край.*

**А)** 0. **Б)** 1. **В)** 2. **Г)** 3. **Д)** 4.

**17.** У якіх словах з дадзеных ***[в]*** прыстаўны?

*1) вобраз; 2) вольха; 3) волас; 4) вада.*

**А)** ва ўсіх словах. **Б)** няма такіх слоў. **В)** у 1, 2. **Г)** у 2, 3. **Д)** у 3, 4.

**18.** Прачытайце вершаваныя радкі І. Савіцкага. Колькі ўсяго ***[у]*** у словах вершаваных радкоў?

*Мінаюць зімы, дні і вёсны,*
*Час тчэ жыцця прыгожа кросны…*
*А мы жывём у Беларусі,*
*Дзе, як анёл, лятае Бусел.*

**А)** 1. **Б)** 2. **В)** 3. **Г)** 4. **Д)** 5.

**19.** Дадзены прыклады: *1) лі́па; 2) са́ні; 3) ра́ма; 4) рака́.* Памяняйце месцамі ў словах толькі зычныя літары (націск у словах можа змяніцца). У якім(-іх) прыкладзе(-ах) атрымаецца назоўнік і дзеяслоў?

**А)** ва ўсіх прыкладах. **Б)** у 1, 2. **В)** у 2, 3. **Г)** у 3. **Д)** у 4.

**20.** Поплаў – гэта … .

**А)** выдатны плывец. **Б)** рачная трава. **В)** тканы выраб.
**Г)** луг у пойме ракі. **Д)** корм для рыбы.

**21.** Паўлінка павінна была запісаць назоўнікі *спектакль, ансамбль, фестываль* у форме множнага ліку роднага склону. Які(-ія) назоўнік(-і) дзяўчынка напісала правільна?

*1) спектаклей; 2) ансамблей; 3) фестываляў.*

**А)** усе назоўнікі. **Б)** няма такіх назоўнікаў. **В)** 1, 2. **Г)** 2. **Д)** 3.

**22.** Прататыпам галоўнага героя якога твора Якуба Коласа быў яго малодшы сын?

**А)** “Новая зямля”. **Б)** “Сымон-музыка”. **В)** “Міхасёвы прыгоды”.
**Г)** “Рыбакова хата”. **Д)** “Рак-вусач”.

**23.** Сок з выціснутага вінаграду называецца … .

**А)** мякіш. **Б)** мязга. **В)** адвар. **Г)** сусла. **Д)** апад.

**24.** Як сказаць адным словам?

*1) аднаго колеру; 2) выданне ў адным томе;*
*3) палавіна стагоддзя; 4) фігура з пяццю гранямі.*

Выберыце правільныя варыянты:

*а) аднакаляровы; б) адзінакаляровы; в) аднатомнае выданне;*
*г) адзінатомнае выданне; д) паўстагоддзя; е) полстагоддзя;*
*ё) пяцігранны; ж) пяцціграннік.*

**А)** 1-а, 2-в, 3-д, 4-ё. **Б)** 1-а, 2г, 3-е, 4-ё. **В)** 1-а, 2-в, 3-е, 4-ж.
**Г)** 1-б, 2-г, 3-е, 4-ж. **Д)** 1-б, 2-в, 3-д, 4-ё.